**Наша віншаванне**

### Доктару гістарычных навук, прафесару Анатолю Пятровічу ГРЫЦКЕВІЧУ



*Сардэчна віншуем Вас, вядомага навукоўца, сябра Рады Беларускага фонду культуры, рэдкалегіі «Краязнаўчай газеты», з 80-годдзем!*

*Шчыра зычым моцнага здароўя, далейшых Вашых няўрымслівых навуковых пошукаў і новых даследчых здабыткаў на карысць беларускай гістарычнай навукі і адраджэння гістарычнай памяці нашага народа!*

*Выканкам Беларускага фонду культуры*
*Рэдкалегія «Краязнаўчай газеты»*

# З ліку шляхетных

Шлях у свет музы Кліо Анатоля Грыцкевіча, як і яго брата Валянціна Пятровіча, своеасаблівы: абодва яны закончылі на той час мінскія вышэйшыя навучальныя ўстановы – замежных моў і медыцынскі інстытуты. Адпаведна, рыхтавалі сябе да ўрачэбнай дзейнасці. Папрацаваўшы пэўны час на гэтай высакароднай ніве, затым абралі іншую пуцявіну.

А. Грыцкевіч зацікавіўся гісторыяй Беларусі эпохі феадалізму, прыватнаўласніцкіх гарадоў, шляхецкага саслоўя, генеалогіяй, рэлігійнымі пытаннямі ў ВКЛ. Зацікаўленасць была грунтоўна засведчана ў навуковых працах «Частновладельческие города Белоруссии в XVI –XVIII вв.: (соц.-экон. исслед. истории городов» (Мн., 1975), «Социальная борьба горожан Белоруссии XVI–XVIII вв.» (Мн., 1979) і інш. Крыху пазней пільную ўвагу шматлікіх чытачоў прыцягнулі яго публікацыі ў розных энцыклапедыях і даведніках на самыя розныя тэмы гістарычнага Сярэднявечча. У прыватнасці, шмат пазнавальна-змястоўнага ён напісаў пра падзеі, асоб, нормы жыцця і правы таго часу ў вялікім томе «Скарына», у энцыклапедычным даведніку «Беларусь», у двухтомніку «Вялікае княства Літоўскае», у шматлікіх калектыўных зборніках.

Гэтая і іншыя даследчыцкія працы прынеслі яму ў апошнія дзесяцігоддзі вялікі аўтарытэт. Таму невыпадкова ён з'яўляецца галоўным рэдактарам многіх выданняў, дзе самыя новыя даследаванні сучасных аўтараў на самыя розныя тэмы нашай гісторыі і ў кантэксце з гісторыяй суседніх краін (двухтомнік «Славутыя імёны Бацькаўшчыны», выдадзены Беларускім фондам культуры, «Рэфармацыя і грамадства. XVI стагоддзе» і інш.). Як невыпадкова і тое, што менавіта яго, глыбока дасведчанага, разважлівага, інтэлігентнага, не адно ўжо дзесяцігоддзе абіраюць на чале розных грамадскіх аргкамітэтаў па святкаванні юбілеяў лёсавызначальных падзей і асоб Беларусі. Вось і цяпер вядомыя нашыя гісторыкі і навукоўцы іншых даследчых галін, мастакі, пісьменнікі, грамадскія дзеячы, краязнаўцы папрасілі яго ўзначаліць аргкамітэт «Міленіум Літвы» ў сувязі са святкаваннем 1000-годдзя назвы Літва ў нямецкіх Кведлінбургскіх аналах, а таксама і ў сувязі з тым, што старажытная назва «Літва» адносіцца да сучасных беларускіх земляў, а пасля ўтварэння ВКЛ яе, назву, аднеслі на назоў новай дзяржавы.

*Моцы, новых светлых задум і здзяйсненняў, Анатоль Пятровіч!*

*Генрых ДАЛІДОВІЧ*



*Вітаўт Кіпель, Анатоль і Валянцін Грыцкевічы, Адам Мальдзіс на семінары ў Ракаве (Валожынскі раён)*